Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-08-16

# Ілюстраваныя старонкі гісторыі ВКЛ

6 жніўня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа адбылася прэзентацыя выдання Уладзіміра Арлова і Змітра Герасімовіча «Вялікае Княства Літоўскае. Ілюстраваная гісторыя». Гэты дзень быў абраны для прэзентацыі невыпадкова. У. Арлоў нагадаў, што менавіта ў гэты дзень 495 гадоў таму Францыск Скарына выдаў першую беларускую друкаваную кнігу. Ілюстраваная гісторыя ВКЛ, выдадзеная вядомым славацкім выдавецтвам «Kalligram», пабачыла свет у друкарні г. Марцін. Чарговая гістарычная кніга з'яўляецца працягам беларускамоўнага альбома 2003 года «Краіна Беларусь» і двухмоўных (беларускі, англійскі) выданняў Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"» 2005 і 2007 гадоў «Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы».

У кнізе 70 раздзелаў, якія ахопліваюць гістарычныя часы ад III тысячагоддзя да н.э. да сённяшніх дзён. Гісторыя Беларусі разглядаецца як частка агульнаеўрапейскага руху цывілізацыі. Асобныя раздзелы прысвечаныя знакавым гістарычным асобам: князям Міндоўгу, Войшалку, Трайдзеню, Віценю, Давыду Гарадзенскаму, Гедзіміну, Альгерду, Андрэю Полацкаму, Ягайлу, а таксама іншым палітыкам, военачальнікам і асветнікам. Шэраг раздзелаў апавядае пра барацьбу за нацыянальнае адраджэнне і лёс Віленшчыны ў XX стагоддзі. Выданне багата ілюстраванае: змяшчае каля 2 000 ілюстрацыяў, у тым ліку летапісныя мініяцюры, сярэднявечныя гравюры, мастацкія гістарычныя рэканструкцыі, фотаздымкі (надрукаваныя ўпершыню).

На прэзентацыі выступілі сябры аўтарскага калектыву выдання – аўтар тэксту У. Арлоў, мастак З. Герасімовіч, рэцэнзент Уладзімір Ляхоўскі, рэдактар Зміцер Санько, аўтар мастацкіх гістарычных рэканструкцыяў Павел Татарнікаў, старшыня ТБМ Алег Трусаў і інш.

Наклад выдання 5 000 асобнікаў. Кнігу, а таксама новае перавыданне альбома 2003 г. «Краіна Беларусь» можна набыць у кнігарнях, напрыклад, у мінскай краме «Акадэмкніга».

Аддзелам рэдкіх кніг і рукапісаў да імпрэзы была падрыхтаваная выстаўка «Старонкі гісторыі і культуры Беларусі». Сярод яе экспанатаў «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» Мацея Стрыйкоўскага (1582), выданні актаў, граматаў, заканадаўчых дакументаў. Асобны раздзел прысвечаны прадукцыі першых беларускіх друкарняў.

***Наш.кар.***
***Фота з www.budzma.org***



"Краязнаўчая газета". Ілюстраваныя старонкі гісторыі ВКЛ